# АСАЦЫЯТЫЎНАЕ ЗАПАМІНАННЕ СЛОЎНІКАВЫХ СЛОЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***Харытонава В. В.*** *(УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік*** *– А. В. Солахаў, канд. філал. навук, дацэнт*

Засваенне слоўнікавых слоў вучням пачатковых класаў даецца з вялікай цяжкасцю, а завучванне гэтых слоў не дае станоўчых вынікаў, таму што памылкі ў слоўнікавых словах часцей за ўсе дапускаюць дзеці, у якіх навучанне ідзе нялегка і няроўна, а ў іх, як вядома, у большасці выпадкаў памяць развіта слаба, увага недастаткова ўстойлівая. Таму пошук найболей эфектыўных метадаў слоўнікавай працы сення з'яўляецца актуальнай задачай.

Псіхолагамі даказана, што для малодшых школьнікаў характэрны наглядна-вобразны тып мыслення, таму неабходна арганізаваць працу са слоўнікавымі словамі так, каб працэс іх засваення праходзіў у займальнай форме, жыва і запамінальна. Для гэтага можна выкарыстоўваць шэраг эфектыўных прыемаў, з дапамогай якіх цяжкія для напісання словы з легкасцю замацоўваюцца ў памяці дзіцяці. Каб вучням было цікава, неабходна звязваць са слоўнікавым словам яркія вобразы, што-небудзь незвычайнае, знайсці нечаканы паварот у тлумачэнні слова або якую-небудзь асацыяцыю [1].

Доктар педагагічных навук, прафесар І. Ю. Мацюгін, даследуючы мэтазгодны спосаб арганізацыі запамінання малодшымі школьнікамі правапісу слоўнікавых слоў, прапанаваў выкарыстоўваць сістэму мнематэхнікі, заснаваную на рэалізацыі асацыятыўнага метаду.

Сутнасць метаду заключаецца ў тым, што «цяжкая арфаграма звязваецца з яркім асацыятыўным вобразам, які ўспамінаецца пры напісанні дадзенага слоўнікавага слова і дапамагае правільна напісаць слова з арфаграмай» [2, с. 41]. Мэта нашага даследавання – праверыць дзейснасць гэтага метаду на ўроках беларускай мовы. Пры навучанні малодшых школьнікаў беларускай мове мы выкарыстоўвалі некалькі пры емаў асацыятыўнага метаду слоўнікавай працы. Для выяўлення іх дзейснасці ўжывалі метад назірання і статыстычны.

Прыем «узмацнення» літары слова, якую трэба запомніць, заключаецца ў вырабе картак з цяжкімі для запамінання словамі, якія раздрукоўваюцца буйным шрыфтам, а літара, якую трэба запомніць, вылучаецца іншым, яркім колерам. Такія карткі размяшчаюцца на бачным для вучня месцы. Эфектыўнаму запамінанню слоўнікавага слова спрыяе таксама выразнае шматразовае прамаўленне слоў з узмоцненым вылучэннем гука, які абазначаецца літарай, якую трэба запомніць.

Прыем графічных асацыяцый заснаваны на тым, што для запамінання неправяральнай арфаграмы ў слоўнікавым слове робіцца малюнак прадмета, па абрысах падобнага на «цяжкую» літару. Словы з малюнкамі адной з літар у вобразе прадмета добра запамінаюцца і легка ўзнаўляюцца пры напісанні слоўнікавых дыктовак.

Для запамінання неправяральнай літары мы шырока выкарыстоўвалі прыем гукавых асацыяцый, сутнасць якога заключаецца ва ўключэнні слоўнікавага слова разам з сугучным яму, у якім «цяжкая» літара гучыць легка і выразна, у словазлучэнне або сказ:

*Бібліятэка* — Біблія з бібліятэкі. *Верабей* — Вера, Вера, верабей! *Медаль* — Медаль з медзі.
*Веласіпед* — Веласіпед без педалі. *Сонца* — Праганяе сон сонца. *Метро* — Метр да метро.
*Сініца* — Сіняе неба над сініцай. *Акварыум* — Рака варыў у місцы. *Радыст* — Рады радысцы.
*Песенька* — Сенька, гучыць песенька! *Паліто* — У Паліны паліто. *Баб ер* — Даб ер баб ер.
*Памідоры* — Палі ў Доры памідоры. *Біяграфія* — Б і я, граф і я. *Дзяцел* — Дзяцей да цела дзяцел пырскае. *Беларусь* — Белая-белая Русь.

Паралельна выкарыстоўваліся вершы, вяселыя рыфмоўкі, шарады. Чым смяшней і нечаканей асацыятыўная сувязь паміж словамі, тым эфектыўней запамінанне. Напрыклад:

*Дзяцел дзюбаю задзеўб, / Дзень аж не абедаў, / За гадзіну ен надзеўб / Дзесяць караедаў* (Міхась Пазнякоў).

Такім чынам, гукавыя асацыяцыі, заснаваныя на ўяўленні і фантазіі,ператвараюць запамінанне слоўнікавых слоў у займальны занятак малодшых школьнікаў на ўроку. Пры правядзенні кантрольных слоўнікавых дыктовак адзначаюцца адзінкавыя выпадкі напісання слоўнікавых слоў з памылкамі.

**Літаратура**

1. Матюгин, И. Ю. Как запоминать слова? / И. Ю. Матюгин [и др.]. – М. : Сталкер, 1997. – 441 с.

2. Кирилина, Г. В. Развитие познавательных и творческих способностей при запоминании словарных слов / Г. В. Кирилина // Начальная школа. – 2015. – № 5. – С. 41–45.



МГПУ им. И.П.Шамякина